І. СТАЛІН.

# ЗА БАЯВОЕ ВЫКАНАННЕ ЎКАЗАННЯЎ тав. ГІКАЛО

## (ДА ВЫНІКАЎ XII ПЛЕНУМА ЦК ЛКСМБ)

Нядаўна закончыў сваю работу 12 пленум ЦК комсамола Беларусі, пленум, які з'явіўся яшчэ і яшчэ раз выражэннем выключнай, бязмежнай адданасці і манапітнай згуртаванасці комсамола Савецкай Беларусі вакол ЦК КП(б)Б, вакол большэвіцкай партыі, вялікага правадыра пролетарскай рэволюцыі таварыша СТАЛІНА.

З'яўленне на пленуме найлепшага большэвіка, ленінца-сталінца сакратара ЦК КП(б)Б Нікалая Фёдаравіча ГІКАЛО выклікала буру авацый, прывітанняў і лозунгаў. Пленум у асобе тав. Гікало, стоячы, вітаў Комуністычную партыю, таварыша СТАЛІНА.

Выступленне тав. ГІКАЛО, прысутнічанне тав. Валковіча, членаў бюро ЦК і загадчыкаў аддзелаў ЦК КП(б)Б—з'яўляецца найлепшым выражэннем любві, дапамогі і клопатаў, якія праяўляе партыя аб ленінскім комсамоле, аб рабоча-калгаснай працоўнай моладзі нашай соцыялістычнай радзімы.

Пленум абмеркаваў выключнай важнасці пытанні далейшай работы арганізацыі: аб выкананні рашэнняў ЦК ВКП(б), бюро ЦК ВЛКСМ і бюро ЦК КП(б)Б аб рабоце комсамола Беларусі: аб развіцці фізкультурнай работы, асабліва ў вёсцы, і аб становішчы падрыхтоўкі масавых кваліфікаваных сельска-гаспадарчых кадраў і ўдзелу ў гэтым комсамольскіх арганізацый.

Асаблівая ўвага пленума была ўдзелена першаму пытанню, асноўнаму пытанню работы ўсёй арганізацыі. Абмяркоўваючы гэтае пытанне, пленум падвергнуў жорсткай крытыцы і детальнай праверцы асноўныя рашаючыя вузлавыя пытанні жыцця і дзейнасці ўсяго комсамола Беларусі, бо рашэнні ЦК ВКП(б), ЦК ВЛКСМ і ЦК КП(б)Б былі, ёсць і астануцца на працяглы адрэзак часу праграмай барацьбы за большэвіцкія справы ўсяго ЛКСМБ.

За прайшоўшы прамежак часу з моманту рашэння ЦК ВКП(б), ЦК ВЛКСМ і ЦК КП(б)Б, комсамол Беларусі дабіўся рада поспехаў у справе паляпшэння работы і ліквідацыі недахопаў, указаных у рашэннях, у справе павышэння класавай пільнасці, ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, у арганізацыі і забеспячэння актыўнага ўдзелу комсамола ў гаспадарча-палітычным жыцці рэспублікі.

Пленум, не супакойваючыся на дасягнутым, з усёй рашучасцю падкрэсліў наяўнасць у арганізацыі яшчэ аграмаднейшых недахопаў на радзе важнейшых участкаў работы комсамола Беларусі.

Нікалай Фёдаравіч ГІКАЛО ў сваёй вялікай краснай прамове на пленуме ЦК ЛКСМБ, паказаўшы агромадную работу партыі па будаўніцтву бяскласавага соцыялістычнага грамадства, якая з'яўляецца наглядным вучэбным дапаможнікам у справе большэвіцкага выхавання мас рабоча-калгаснай працоўнай моладзі,—паставіў перад ЛКСМБ новыя задачы, новыя павышаныя патрабаванні, выцякаючыя з гістарычнага рашэння лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б), уступлення ў новы 1935 год—трэці год другой большэвіцкай пяцігодкі.

Таварыш Гікало заклікаў ЛКСМБ так арганізаваць большэвіцкае выхаванне комсамольца, каб ён стаў сапраўдным большэвіком арганізатарам і агітатарам, каб ён змог зразумець веліч дасягненняў будаўніцтва соцыялізма, зразумець важнасць мерапрыемстваў партыі, давёў іх да мас моладзі, растлумачыў моладзі і арганізаваў яе на выкананне рашэнняў партыі, з усёй большэвіцкай дакладнасцю.

— Жыццё ўскладняецца, ускладняецца і барацьба і метады барацьбы,—гаварыў таварыш Гікало,—класавы вораг не той, што быў некалькі гадоў таму назад. Змяніліся і формы і метады яго барацьбы. Трэба быць палітычна пісьменным, востра празорлівым і ў тэорыі і практыцы, каб распазнаць ворага і бязлітасна яго знішчаць.

Не глядзячы на праведзенне самаачысткі ЛКСМБ ад класава-варожых элементаў, нам комсамолу Савецкай Беларусі—заходняму фарпосту соцыялістычнай радзімы трэба яшчэ лепш, яшчэ больш працаваць над павышэннем класавай пільнасці і далейшым умацаваннем класавай боездольнасці сваіх радоў.

Пленум ЦК ЛКСМБ адобрыў рашэнне X пленума ЦК ВЛКСМ аб масава-палітычнай і культурнай рабоце комсамола, у асаблівасці палітычнай адукацыі комсамольцаў і моладзі. Пленум лічыць галоўнай задачай усіх членаў ЦК, сакратароў ГК і РК первічных арганізацый—сілаю АСАБІСТАГА ПРЫКЛАДУ ў няўхільным ажыццяўленні рашэнняў пленума і мобілізацыі на выкананне гэтых рашэнняў кожнага комсамольца.

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ